**Юлія Габрусёнак**

## Сэрца маці

Тэкля не чула, як з акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўгажаданага сына…

Яна не чула, што гаварыў ёй у след лёкай, што казалі людзі, якім яна замінала ісці па тратуары. У вушах гучаў голас Лаўрэнція Кіпрыянавіча, яе Лаўручка: “Ідзі, старушка! Я цябе... не знаю…”

Даўкія слёзы каціліся па зморшчаным твары. Здавалася, што яшчэ крыху – і сэрца абарвецца, замлее…

Штосьці цяжкае хіліла Тэклю да зямлі, навальвалася на яе плечы. Яна за гэтыя некалькі хвілін быццам зменшалася, сціснулася. Ёй захацелася знікнуць, растаць сярод гарадскога тлуму. Душа Тэклі паціху памірала…

Як апынулася за межамі гэтага ашалелага горада, Тэкля не змагла б растлумачыць, нават калі б захацела. Нейкім чынам дапхнулася старая да сваёй хаткі на пагорку, ля лесу. Ёй хацелася толькі аднаго: каб суседкі не лезлі смоллю ў вочы, не пыталіся ні пра горад, ні пра сына…

Суседзі бачылі, як Тэкля вярнулася дамоў, але падысці да яе не адважыўся ніхто. Суседская дзяўчынка Марыська было памкнулася насустрач да Тэклі, але ўбачыла яе невідушчыя вочы, спакутаваны твар - і спынілася. Здавалася, што на плечы старой абрынуўся ўвесь зямны цяжар…

Зайшоўшы ў хаціну, Тэкля не адчувала ні холаду, ні голаду. Не запальваючы лучыны, прыткнулася ля стала. У вушах па-ранейшаму гучалі словы: “Ідзі, старушка! Я цябе... не знаю…” Усплыло ў памяці і папярэджванне Цыпрука: “Чакай ад яго пад старасць пацехі, як ад рабой сучкі яек!” Не, не можа быць, што словы Цыпрука спраўдзіліся. Мой хлопчык проста не пазнаў мяне, не чакаў прыходу маткі. Уга, колькі часу не бачыліся! Гэта лёкай вінаваты, канешне ж, ён са сваёй крываватай усмешкай! Так думала Тэкля, седзячы ў пустой халоднай хаце…

Раніца не прынесла палёгкі. Балела сэрца, балела спакутаваная душа… Тэкля разумела, што і на гэтыя Каляды яна засталася адна. Яшчэ горш, што не ставала сілы нават супакойваць сябе. Каб толькі захацела… Захацела, але атрымалася з гэтага зусім не тое, аб чым марыла, аб чым так упэўнена гаварыла суседзям…

Але праўду людзі кажуць, што час – лепшы лекар. Зіма змянілася вясной, вясна – летам. Тэкля па-ранейшаму жыла ў старой хаціне. Толькі па суседзях хадзіць перастала і стала больш маўклівая. Спачатку суседкі імкнуліся вывесці старую на размову, але, не раз сутыкнуўшыся з яе упартай маўклівасцю, хутка адчапіліся. Нехта прынёс з горада вестку, што тамтэйшы адвакат выгнаў старую маці з дома. І тады вяскоўцы адразу зразумелі, што адбылося з Тэкляй.

І калі спачатку ёй зайздросцілі ( жартачкі, гэткага сына мае!), то цяпер шкадавалі: “Як жа такую больку яе сэрца вытрывала!”

Па-ранейшаму любіла Тэкля  сядзець на прызбе, пазіраць старымі вачыма на цёмны лес, на адвечныя хмаркі. Цяпер у яе з’явіўся другі суразмоўца. Тэкля  пачала размаўляць з Богам. Аб чым яна яго прасіла, хто ведае… Але людзі заўважылі, што і ў царкву Тэкля пачала хадзіць часцей, і пры размове імя Бога успамінаць таксама часцей. А яшчэ Тэкля пачала збіраць лекавыя травы і лячыць імі людзей. На дзіва, і яе малітвы, і зёлкі дапамагалі людзям. Да Тэклі пачалі прыходзіць нават з суседніх вёсак. Дзякавалі за дапамогу хто чым мог: боханам хлеба, кошыкам бульбы, шматком сала. Так і перабівалася старая, але нікому ніколі не жалілася і пра Лаўручка больш не ўспамінала…

Аднойчы каля яе хаты праехала фурманка і спынілася на лузе. З яе павыскоквалі прыгожа апранутыя дзеці і паважна выйшла маладая пані. Дзеці збіралі кветкі, пані хадзіла каля іх пад белым парасончыкам. Раптам адзін хлопчык ускрыкнуў і заплакаў. Пані усхвалявана пачала яму штосьці гаварыць. Тэкля за ўсім гэтым назірала з прызбы. Тут яна заўважыла , што да яе хаціны подбегам спяшаецца фурманшчык.

– Скажы, старая, ці ёсць дзе паблізу які фельчар?
– Няма, бліжэйшы ў горадзе. А гэта міль шэсць будзе. А што там у вас здарылася?
– Ды пчала ўджаліла паніча. Сама ведаеш, можа, і нічога не  будзе, пройдзе, але ж пані вельмі расхвалявалася.
– Вядзіце сюды хлопчыка. Можа, я чым дапамагу.

Фурман пабег на луг, а Тэкля хуценька пайшла ў хату. Пакорпаўшыся ў сваіх вузельчыках, знайшла патрэбныя зёлкі, заварыла іх (добра, што чыгунок у печы стаяў!),  трохі падумаўшы, дастала шкляначку з маззю…

У гэты час расчыніліся дзверы і на парозе з’явіўся фурманшчык. На руках ён трымаў хлопчыка, які цяжка дыхаў. Твар у хлопчыка быў чырвонага колеру, пухліна  на ручцы павялічвалася на вачах.

– Калі ласка, дапаможыце! Мы не паспеем давезці яго да горада! – з адчаем у голасе прасіла пані. – Калі  з ім што здарыцца, я не перажыву!
– Чым змагу, тым дапамагу,  коратка сказала Тэкля.

Яна глядзела на хлопчыка і вачам сваім не верыла. Перад ёй ляжаў яе Лаўручок, маленькі светлавалосы хлопчык. Здавалася, ён зараз расплюшчыць вочы, убачыць яе і скажа: “Мама!”

Тэкля схамянулася і хуценька стала націраць хлопчыка маззю, потым дала папіць адвару. Увесь гэты час яна шаптала малітву. Фурманшчык здолеў разабраць словы: “Божа! Выратуй яго! Лепш забяры мяне…”

Прайшло каля гадзіны, пакуль хлопчыку стала крыху лепш. Тэкля ўвесь гэты час сядзела каля яго і трымала за ручку. Калі яна ўбачыла, што небяспека мінула, то з палёгкай выдыхнула…

– Мама, якія ў бабулі мяккія рукі! Як у цябе і ў таты, – раптам пачула Тэкля.
– Сынок, гэтыя рукі цябе толькі што выратавалі, – з удзячнасцю прамовіла маладая пані…

Тэкля маўчала… Даўкія слёзы каціліся па яе маршчыністым твары…

Праз тыдзень каля Тэклінай хаты спынілася багатая фурманка. З яе выйшла маладая пані, высокі мужчына і маленькі хлопчык, які з крыкам “Бабуля!” кінуўся ў хату.

Тэкля не магла ступіць і кроку… Зноў ад нечага незразумелага захлынулася сэрца…

– Даруй за ўсё, мама! І дзякуй табе за выратаванага сына!

Тэкля пачула словы, якія яна ўжо і не чакала пачуць…

Душа Тэклі ажывала…